ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1984
17 МАЯ
ЧАЦВЕР
№ 17 (1430)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"
ТЭЛЕТАЙП
• Учора • Сёння • Заўтра •

## ДЫСКУСІЯ

«У чым заключаецца адказнасць СССР і ЗША за садзейнічанне эканамічнай і палітычнай стабільнасці і росту краін, што развіваюцца» прайшла нядаўна ў актавай зале БДУ імя У. І. Леніна.

У састаў каманды ЗША ўвайшлі Бердзі Мішэль — выпускніца Амерст каледжа (г. Нью-Йорк), рэферэнт Міжнароднага савета па даследаваннях і абмену вопытам (г. Нью-Йорк); Мэры Холанд — выпускніца Гарвардскага універсітэта (г. Нью-Йорк), працуе ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый кансультантам Праграмы ААН па раззбраенню (г. Нью-Йорк); Мацью Моснер — выпускнік юрыдычнага факультэта універсітэта штата Мічыган. Кіраўнік каманды — доктар Скот Ноублс, выкладчык Макалестэр каледжа (г. Сант-Паул, штат Мінесота), выкладае курс моўнай камунікацыі і аратарскага майстэрства.

Каманду БДУ імя У. І. Леніна прадстаўлялі Алена Стаўцава і Вячаслаў Санчук — студэнты гістарычнага факультэта, Ігар Велічанскі — выпускнік гістарычнага факультэта. Кіраўнік каманды — Г. М. Пашкоўскі — выпускнік БДУ імя У. І. Леніна, выкладчык гісторыі.

З. АЛЯШКЕВІЧ.

## VII ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ

студэнцкі фестываль палітычнай песні прайшоў ва універсітэце Дружбы народаў імя П. Лумумбы ў г. Маскве. У ім прынялі актыўны ўдзел замежныя і савецкія студэнты БДУ імя У. І. Леніна.

Салісты Энрыка Сільва Маліна (мехмат) і Вавіан Фільберт (журфак) і дуэт філалагічнага факультэта ў саставе Марка Мермана і Леаніда Шырына ўзнагароджаны дыпломамі лаўрэатаў фестывалю, а дэлегацыя нашага універсітэта атрымала Грамату за актыўную работу па прапагандзе палітычнай песні.

Э. АНІСЕНКА.

## НА ПАРАДКУ ДНЯ

чарговага пасяджэння бюро парткома універсітэта стаяла пытанне аб практыцы падрыхтоўкі і правядзення партыйных сходаў у пярвічных партыйных арганізацыях СКТБ з ВВ, АГЧ і кіравання.

Л. МАРЦЫЁНКА.

## У ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЯХ

факультэтаў і падраздзяленняў праходзяць справаздачна-выбарныя сходы. На іх камуністы прынцыпова і па-дзеламу аналізуюць сваю дзейнасць за справаздачны перыяд, намячаюць канкрэтныя планы на будучае.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

● МІТЫНГ ●

# «МЫ ГАЛАСУЕМ ЗА МІР!»

«МЫ ГАЛАСУЕМ ЗА МІР!» — пад такім дэвізам адбыўся ў мінулую нядзелю на стадыёне БДУ імя У. І. Леніна мітынг, арганізаваны камітэтам камсамола універсітэта, у якім прынялі ўдзел студэнты больш чым з 20 краін свету. Дзень выдаўся пахмурным, а к пачатку мітынгу пайшоў дождж. Але нягледзячы на дрэннае надвор'е студэнты прыйшлі сюды, каб выказаць сваю падтрымку ўзрастаючаму міжнароднаму руху за мір ва ўсім свеце. Удзельнікамі мітынгу была прынята рэзалюцыя, якую падтрымалі і падпісалі ўсе прысутныя. Вось яе змест:

«Мы, удзельнікі мітынгу, сабраліся сёння, калі абстаноўка ў свеце выклікае сур'ёзную заклапочанасць і трывогу ўсяго чалавецтва, каб яшчэ раз выказаць падтрымку народам, якія вядуць барацьбу за мір, свабоду і дэмакратыю.

Забяспечыць усеагульны мір — вось галоўная задача чалавецтва. Мы заяўляем рашучы пратэст супраць планаў імперыялізму на чале з ЗША уцягнуць нашу планету ў ядзерную катастрофу. Не дадзім узарваць свет! Мы адабраем рашэнне аб правядзенні ў 1985 годзе XI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у горадзе Маскве».

Прэзідэнт лігі іракскіх студэнтаў г. Мінска аспірант БДУ імя У. І. Леніна Алі Хасан падпісаў рэзалюцыю адным з першых. Ён сказаў: «Мы ведаем, што галоўнай задачай усіх прагрэсіўных сіл свету з'яўляецца ўмацаванне дружбы паміж народамі. Мы адабраем міралюбівую палітыку Савецкага Саюза ў барацьбе за абмежаванне гонкі ўзбраенняў, за трывалы мір ва ўсім свеце».

У прамовах усіх выступаючых — прадстаўнікоў студэнцкіх зямляцтваў Марока, Сірыі, Палесціны, Лівана і іншых — падкрэслівалася, што ва ўмовах міжнароднай напружанасці, перад пагрозай ядзернай катастрофы не павінна быць тых, хто стаіць у баку ад барацьбы за мір. Барацьба за мір — гэта барацьба за жыццё ўсяго чалавецтва, гэта святы абавязак усіх краін і народаў.

— Нас тут многа — студэнтаў розных краін. Мы размаўляем на розных мовах, але ў нас агульнае імкненне да міру,— сказаў студэнт фізічнага факультэта з В'етнама Чан.

Мітынг «Мы галасуем за мір!» яшчэ раз пераканаў, што прагрэсіўная моладзь поўная рашучасці адстаяць мір на планеце.

Мітынг прайшоў у духу дружбы і ўзаемаразумення і закончыўся канцэртам, які падрыхтавалі савецкія і замежныя студэнты.

А. ВАЛЬВАЧОЎ,
удзельнік мітынгу.



## ТЫДЗЕНЬ САВЕЦКА-БАЛГАРСКАЙ ДРУЖБЫ

З 14 ПА 18 МАЯ ва універсітэце праходзіць тыдзень савецка-балгарскай дружбы.

Аб супрацоўніцтве Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна і Сафійскага універсітэта імя К. Ахрыдскага, аб дружбе паміж савецкім і балгарскім народамі расказваюць матэрыялы, падрыхтаваныя універсітэцкім аддзяленнем Таварыства савецка-балгарскай дружбы, якія змешчаны на 2-й і 3-й старонках нумара.

**НА ЗДЫМКУ: балгарскія аспіранты ў інтэрнаце № 2 БДУ імя У. І. Леніна.**

Фота С. Плыткевіча.

● ПАЗЫЎНЫЯ ТРЭЦЯГА ПРАЦОЎНАГА ●

# ДАПАМОГУЦЬ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ

НАБЛІЖАЕЦЦА ЛЕТА. Пачынаецца трэці працоўны семестр. У святле рашэнняў майскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС перад сельскагаспадарчымі атрадамі стаіць задача памнажаць свой уклад у рэалізацыю Харчовай праграмы. Для выканання яе на фізічным факультэце былі сфарміраваны тры сельскагаспадарчыя атрады: імя П. М. Машэрава (камандзір Л. Якавюк, камісар Н. Новікава), імя Ю. А. Гагарына (А. Трасцінская, А. Абрамовіч), імя Л. А. Арцімовіча (Т. Фамінская, Г. Навасёлава).

Дзейнасць атрадаў складаецца з двух асноўных перыядаў: падрыхтоўчага і працоўнага. Мэтай падрыхтоўчага перыяду з'яўляецца фарміраванне атрада і падрыхтоўка яго да вытворчай і грамадска-палітычнай дзейнасці.

У сакавіку гэтага года нашы атрады заключылі дагаворы з гаспадаркамі Уздзенскага раёна Мінскай вобласці.

Байцы нашых атрадаў — гэта ў асноўным студэнты першага курса, якія ўпершыню едуць у СБА. Таму работа ў атрадзе зараз накіравана на растлумачэнне важнасці студэнцкага будатрадаўскага руху, вывучэнне Статута СБА, абавязкаў і правоў байца СБА, згуртаванне членаў атрада.

Да 40-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у атрадзе імя Арцімовіча падрыхтавана выступленне агітбрыгады на тэму «Подзвігу тваіму, Беларусь, прысвячаецца...» У атрадзе імя Гагарына падрыхтавана і прачытана лекцыя пра Героя Сацыялістычнай Працы старшыню калгаса «Рассвет» Магілёўскай вобласці К. Т. Арлоўскага. Ва ўсіх атрадах праходзяць сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, удзельнікамі партызанскага руху і байцамі СБА мінулых гадоў.

Лектарскай групай СБА імя Гагарына ў сярэдняй школе № 75 г. Мінска прачытана лекцыя аб жыцці і дзейнасці Ю. А. Гагарына. Атрады адпрацавалі на суботніках 110 чалавека-гадзін. Байцы нашых СБА вырашылі наступны суботнік правесці на станцыі метро «Плошча Леніна».

Студэнцкія атрады сёння — гэта рэальная сіла ў ажыццяўленні планаў партыі і народа. І мы спадзяемся, што здолеем унесці свой уклад у выкананне сельскагаспадарчых планаў 1984 года.

А. ТРАСЦІНСКАЯ,
камандзір СБА імя Гагарына;
Г. НАВАСЁЛАВА,
камісар СБА імя Арцімовіча.

● СЁННЯ — ТРЫВАЛЫЯ ВЕДЫ, ЗАЎТРА — ЭФЕКТЫЎНАЯ ПРАЦА ●

У ПЕРШЫ ДЗЕНЬ вытворчай практыкі я ўзрадаваўся. Як тут добра! Не было ні лекцый, ні семінараў, ні дамашніх задач... Карацей, поўная свабода! Думаў: што хачу—магу зрабіць, а чаго не хачу — не буду рабіць. Раніцай падымацца можна ў 11—12 гадзін. А вечарам: кіно, тэатр або проста прагулка... Як рана да нас прыйшла вясна!

# ДА СУСТРЭЧЫ, ПРАКТЫКА!

Хутка я зразумеў, што памыляўся. Ужо на другі дзень у мяне праверылі план работы, дзённік практыкі, веды па тэхніцы бяспекі, спыталі, чаму спазніўся...

Працоўная атмасфера на кафедры ядзернай фізікі захапіла мяне. Лепшым прыкладам адносін да справы быў мой навуковы кіраўнік асістэнт А. Я. Прахін. Ён паставіў канкрэтную задачу — стварыць устаноўку для спецпрактыкума па вымярэнню ядзернага магнітнага рэзанансу ў праточнай вадкасці. «Усё для ўстаноўкі!» Гэта прапанова гучала для нас як лозунг. Я паступова зразумеў, што практыка — гэта перш за ўсё сабранасць і дысцыпліна. План — закон, і яго абавязкова патрэбна выканаць. А тым самым паказаць, на што мы здольны.

Я не буду расказваць пра цяжкасці. Яны, зразумела, былі. І ў час праверкі і юсціроўкі магніта, вага якога намнога большая за маю. І хваляванні, калі некалькі дзён не атрымлівалі ніводнага спектра, супадаючага з тэорыяй... А потым высветлілася, што проста адарвалася катушка ў трубцы датчыка.

Не буду пералічваць таксама радасныя мінуты. А іх было намнога больш, чым непрыемных.

Нарэшце наша ўстаноўка сабрана і перададзена ў лабараторыю, дзе кожны дзень абслугоўваюць студэнты 4-га курса. Я шчаслівы, што яна добра працуе і прыносіць карысць маім малодшым сябрам.

Хочацца адзначыць, што практыка дала нам многае: і вопыт, і навыкі ў рабоце з прыладамі, а самае галоўнае — упэўненасць, упартасць і рашучасць у рабоце. Усё гэта дапаможа і ў далейшых навуковых даследаваннях, і ў жыцці.

Сёння, скончыўшы вучэбную практыку, хочацца сказаць: «Вялікае дзякуй усім, хто дапамагаў мне, хто працаваў побач!»

Нас чакае самая адказная практыка — наша самастойная работа на карысць сваёй Радзімы. Хочацца верыць, што мы пройдзем яе паспяхова.

Да хуткай сустрэчы, практыка!

НГУЕН ХАК Х'ЕУ,
студэнт 5 курса
фізічнага факультэта.

# «ЛІЧУ— МНЕ ПАШАНЦАВАЛА»

ЁСЦЬ ЛЮДЗІ, для якіх актыўная творчая праца з'яўляецца абавязковай умовай іх існавання. Яны, як правіла, заўсёды знаходзяцца на пярэднім краі сваёй галіны ведаў, і дзякуючы сваёй працаздольнасці і незадаволенасці дасягнутым рухаюць наперад рубеж навукі. Праца пад кіраўніцтвам такога вучонага нялёгкая, напружаная, але затое цікавая і плённая.

Мне пашанцавала трапіць іменна да такога чалавека — прафесара, доктара тэхнічных навук Аляксандра Сяргеевіча Міхалёва, які загадвае кафедрай кібернетыкі факультэта радыёфізікі і электронікі БДУ імя У. І. Леніна.

Кафедра маладая, яна створана ўсяго тры гады назад, і працуе тут моладзь. Але навуковыя праблемы, якімі займаецца гэты калектыў, сур'ёзныя. Вынікі працы кафедры знаходзяць прымяненне ў навейшай галіне сучаснай прамысловасці — робататэхніцы. Задачы, якія стаяць перад гэтым калектывам, вызначаюцца сваёй складанасцю і незвычайнасцю. Яны патрабуюць добрага валодання ведамі адразу некалькіх навук, такіх, як тэорыя аўтаматычнага кіравання і яе сучасныя напрамкі, тэорыя электрапрываду, вышэйшая матэматыка і праграміраванне электронна-вылічальных машын і мікраЭВМ. А яшчэ патрабуецца ўменне працаваць рукамі ў майстэрні.

Зразумела, што паспяховая работа ў такіх умовах немагчыма без навуковага кіраўніка, які па-сапраўднаму ўлюблёны ў сваю справу.

Мы ўсе, аспіранты кафедры, вучымся ў свайго навуковага кіраўніка А. С. Міхалёва працавітасці і ўменню рабіць глыбокі навуковы аналіз, вызначаць і ставіць навуковыя задачы, вучымся паслядоўнасці і сістэмнасці пры даследаванні кожнай праблемы, кожнага аб'екта.

Але не толькі высокім прафесійным майстэрствам валодае мой навуковы кіраўнік, а і ўменнем працаваць з людзьмі, аб'ядноўваць іх адзінай мэтай і весці за сабой, быць адначасова і строгім, і добрым, і патрабавальным, і заўсёды гатовым дапамагчы. А рэзультатам гэтага падыходу з'яўляецца тая атмасфера таварыскасці і ўзаемадапамогі, у якой так прыемна працаваць і далёка ад роднага дома не адчуваць сябе ў адзіноце.

Мне вельмі пашанцавала, што я працую пад кіраўніцтвам такога цудоўнага чалавека, як прафесар А. С. Міхалёў. Для мяне ён застанецца прыкладам для пераймання ў маёй будучай дзейнасці.

**Дора ДЗІМІТРАВА,**
**аспірантка факультэта радыёфізікі і электронікі, дэпутат Народнага сходу НРБ.**

# ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

● **ДА 9 ВЕРАСНЯ 1944 года ў Балгарыі быў адзін мільён непісьменных, 27 працэнтаў вёсак не мелі школ, больш за 100 000 дзяцей не наведвалі школы і толькі 28 працэнтаў моладзі мелі пачатковую адукацыю.**

● **У 1939 ГОДЗЕ ў Балгарыі было толькі пяць вышэйшых навучальных установ. Сёння Балгарыя — адна з пяці краін свету па колькасці студэнтаў на кожныя 10 000 чалавек насельніцтва.**

● **СЁННЯ ў розных галінах народнай гаспадаркі Балгарыі працуе каля 290 тысяч спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Гэта значыць, што на 1000 працуючых прыходзіцца 63 чалавекі з вышэйшай адукацыяй. Сярод тых, хто мае вышэйшую адукацыю, 36 працэнтаў — жанчыны.**

# НЯМА НІЧОГА ДАРАЖЭЙ!

ДАЎНЯЯ ДРУЖБА звязвае СССР і НРБ, ВЛКСМ і Дзімітраўскі Камуністычны Саюз Моладзі. Адной з форм супрацоўніцтва брацкіх саюзаў з'яўляецца абмен студэнцкімі будаўнічымі атрадамі. У 1982 годзе БДУ імя У. І. Леніна заключыў дагавор аб абмене будатрадамі з Ямбольскім педагагічным інстытутам імя Д. Благоева.

Надыходзіць трэцяе будатрадаўскае лета, калі студэнты нашага універсітэта працуюць на будаўніцтве народнагаспадарчых аб'ектаў у акружным цэнтры НРБ горадзе Ямболе, а балгарскі атрад разам з савецкімі студэнтамі працуе ў Беларусі.

Ужо стала добрай традыцыяй, што атрад, які працуе ў Беларусі, носіць імя вядомага дзеяча міжнароднага камуністычнага і рабочага руху, вялікага сябра савецкага народа Георгія Дзімітрава. А атраду, што выязджае працаваць у НРБ, прысвойваецца імя Лілі Карастаянавай — мужнай дачкі балгарскага народа, што змагалася і загінула ў суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны на беларускай зямлі. Мне пашчасціла быць удзельнікам атрада імя Георгія Дзімітрава ў 1982 годзе, дзе разам з намі, савецкімі студэнтамі, працавалі і балгарскія студэнты. Тут яскрава выявіліся брацкі інтэрнацыяналізм і ўзаемадапамога. Кожны быў гатовы прыйсці на дапамогу свайму таварышу.

Час працы ў будаўнічым атрадзе праляцеў хутка. Прыйшоў час развітвацца. Мы пакляліся назаўсёды захаваць у сэрцах успаміны аб гэтых цудоўных, праведзеных разам днях.

Год прайшоў. І вось зноў сустрэча з балгарскімі сябрамі. Але ўжо ў Балгарыі.

Атрад працаваў на будаўніцтве ў горадзе Ямболе разам з балгарскімі брыгадамі — так называюць будатрадаўцаў у нашай братняй краіне. Мы лічым, што нам пашчасціла, бо мы бачылі Балгарыю не з акна экскурсійнага аўтобуса. Мы бачылі Балгарыю працоўную. Нас было дваццаць чалавек, працавалі мы ў Ямболе ўсяго два тыдні. Але гэтага было дастаткова, каб пасябраваць з тымі, хто працаваў побач з намі.

А потым былі экскурсіі, арганізаваныя нашымі балгарскімі сябрамі: Варна, Сонечны Бераг, старажытная Сафія... Ужо тады мы ведалі, што гэта запомніцца назаўсёды.

Усё бліжэй і бліжэй будатрадаўскае лета-84. Добрасумленна рыхтуюцца да працоўнага семестра студэнцкія будаўнічыя атрады імя Георгія Дзімітрава і Лілі Карастаянавай.

**В. ШАДУРСКІ,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола па інтэрнацыянальнаму выхаванню.**

## ● З ФОТААРХІВА РЭДАКЦЫІ ●



Студэнтка III курса філасофскага аддзялення гістарычнага факультэта Дзіяна Савава прыняла актыўны ўдзел у падрыхтоўцы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 40-годдзю сацыялістычнай рэвалюцыі ў Балгарыі.

# ПА ЎЗЫХОДЗЯЧАЙ

УЖО АМАЛЬ два дзесяцігоддзі плённа развіваюцца брацкія кантакты паміж БДУ імя У. І. Леніна і Сафійскім універсітэтам імя К. Ахрыдскага. Заключаны ў снежні 1966 года дагавор аб навуковым супрацоўніцтве прадугледжваў аказанне ўзаемнай дапамогі ва ўдасканаленні вучэбнага працэсу, рэгулярны абмен прафесарска-выкладчыцкімі кадрамі для педагагічнай работы і вывучэння навейшых форм і метадаў арганізацыі вучэбнай, выхаваўчай і навуковай работы, сумесных навуковыя даследаванні і іх публікацыю, падрыхтоўку навуковых кадраў праз аспірантуру і стажыроўку, абмен студэнцкімі групамі для вытворча-азнаямленчай практыкі, узаемаабмен навуковай літаратурай, вучэбнымі планамі, праграмамі, метадычнымі дапаможнікамі і г. д.

**Характэрнай рысай развіцця дружбы, супрацоўніцтва і ўсебаковага збліжэння паміж Савецкім Саюзам і Народнай Рэспублікай Балгарыяй з'яўляюцца шматгранныя сувязі ў галіне навукі і вышэйшай адукацыі. Важкі ўклад у расшырэнне і ўмацаванне гэтых сувязей уносіць Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна.**

Вядучыя прафесары і выкладчыкі Сафійскага універсітэта выступалі са спецкурсамі і цыкламі лекцый. З вялікай увагай слухалі савецкія студэнты лекцыі акадэмікаў Э. Георгіева, Д. Косева, Б. Сендава, прафесараў С. Русакіева, М. Малдаванавай, Х. Несцеравай, А. Мілчава і іншых. На працягу 1979—1981 гадоў на філалагічным факультэце выкладаў балгарскую мову прафесар Сафійскага універсітэта Блажа Блажаў, а з верасня 1981 — дацэнт Цветан Йётаў.

У сваю чаргу лекцыі студэнтам Сафійскага універсітэта чыталі акадэмікі АН БССР У. П. Платонаў, І. Я. Навуменка, Ф. А. Гахаў, прафесары А. Я. Супрун, А. Т. Пікулеў, І. В. Царук, Т. І. Прытыцкая, А. А. Галаўко, М. Т. Раманоўскі і іншыя.

Беларускі універсітэт з'яўляецца важным цэнтрам падрыхтоўкі кадраў для НРБ. Яго закончылі больш як 50 балгарскіх юнакоў і дзяўчат. Звыш 15 балгарскіх аспірантаў паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі. Сярод іх Б. Аркаудаў, Р. Каканакаў, Г. Кастадзінаў, Й. Дзімітраў, Р. Яўцімава і іншыя. Румен Каканакаў, успамінаючы пра гады вучобы ў БДУ імя У. І. Леніна, расказвае: «...Я тут працаваў, як дома. І адчуваў сябе сярод братоў. Гэта галоўнае маё ўражанне за чатыры гады работы тут. За час падрыхтоўкі дысертацыі я апублікаваў адзінаццаць навуковых артыкулаў. Я не змог бы гэтага зрабіць без такой атмасферы супрацоўніцтва, якая склалася на кафедры».

У сваю чаргу Б. Ю. Норман і В. А. Карпаў, якія стажыраваліся ў Сафійскім універсітэце, абаранілі кандыдацкія дысертацыі па балгарскай мове.

Вялікае значэнне надаецца такой форме супрацоўніцтва, як азнаямленчая практыка. За прайшоўшыя гады амаль 500 студэнтаў фізічнага, хімічнага, біялагічнага, механіка-матэматычнага факультэтаў выязджалі ў Балгарыю і столькі ж студэнтаў Сафійскага універсітэта пабывалі ў Мінску. Абмен студэнцкімі групамі садзейнічае павышэнню прафесійнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў, а таксама інтэрнацыянальнаму выхаванню студэнцкай моладзі.

У апошнія гады найбольш эфектыўнай формай узаемадзеяння універсітэтаў-пабрацімаў стала сумесная распрацоўка навуковых даследаванняў, стварэнне інтэрнацыянальных калектываў, праведзенне сумесных эксперыментаў. Калі ў 1978—1980 гг. у межах міжвузаўскага супрацоўніцтва вялася работа па сямі агульных тэмах, то ў гэтай пяцігодцы — па дванаццаці актуальных праблемах фізікі, матэматыкі, біялогіі, геаграфіі, грамадскіх навук.

Прыкладам высокай дзейснасці можа быць інтэграцыя творчых намаганняў кафедр фізікі паўправаднікоў Сафійскага і Беларускага універсітэтаў. У выніку сумеснага пошуку былі дасягнуты важныя рэзультаты. Сумесныя вынаходніцтвы былі зарэгістраваны ў Савецкім Саюзе і НРБ. Прамысловае ўкараненне толькі аднаго навінкі дапамагло павялічыць гадавы эканамічны эфект на суму каля 120 000 рублёў.

Моцная сувязь усталявалася паміж супрацоўнікамі НДІ ФХП і кафедрай неарганічнай хімічнай тэхналогіі Сафійскага універсітэта, кафедрай заалогіі, радыётэхнікі і фізічнай электронікі, агульнага земляробства, метадаў аптымальнага кіравання нашага універсітэта і адпаведных кафедр экалогіі, оптыкі і спектраскапіі, ландшафтазнаўства, сектара даследавання апераций Сафійскага універсітэта.

У наш дынамічны час вялікіх сацыяльных перамен важнае значэнне набывае сумесная работа ў галіне грамадскіх навук. Кафедрамі навуковага камунізму Беларускага і Сафійскага універсітэтаў распрацоўваецца тэма «Сацыяльна-палітычныя праблемы будаўніцтва і функцыяніравання развітога сацыялістычнага грамадства (на матэрыялах НРБ і БССР)».

Эфектыўна супрацоўнічаюць са сваімі балгарскімі калегамі члены кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства, якія займаюцца распрацоўкай

● З ФОТААРХІВА РЭДАКЦЫІ ●



Паспяхова абараніў у БДУ імя У. І. Леніна кандыдацкую дысертацыю Йардан Дзімітраў, які зараз з'яўляецца адным з вядучых выкладчыкаў Варненскага электратэхнічнага інстытута.

# НА МОВЕ ДРУЖБЫ

**И столько ослепительных восходов**
**ещё нам вместе встретить суждено,**
**мы—две державы, два народа,**
**но сердце у двоих одно...**

ЯК ШЧЫРА сказаны гэтыя словы пра дружбу паміж савецкім і балгарскім народамі. Асабліва гэта дружба патрэбна зараз, калі над светам навісла пагроза вайны. Калі я пачынаў дыпломную практыку ў БДУ імя У. І. Леніна, я планаваў адну з маіх рэжысёрскіх работ прысвяціць дружбе паміж Балгарыяй і Беларусіяй.

Для мяне гэта была маленькая спроба выказаць прызнанне і павагу да герояў Шыпкі і Вялікай Айчыннай вайны, да герояў мірныхподзвігаў. Прызнанне тым, хто даваў мне веды на працягу чатырох гадоў у Мінскім інстытуце культуры. Усім, хто зрабіў такім змястоўным слова «дружба». Дружба, якую дзяды перадаюць унукам. Дружба, якая будзе перадавацца з пакалення ў пакаленне.

**ГЕОРГІ МІЦАЎ,**
**студэнт з НРБ.**

# СУПРАЦОЎНІЧАЮЦЬ СЛАВІСТЫ

ПАМІЖ філолагамі-славістамі Беларускага і Сафійскага універсітэтаў ужо даўно існуюць цесныя ўзаемныя сувязі. Яны абменьваюцца спецыялістамі, лектарамі, сумесна распрацоўваюць тэмы ў галіне параўнальнага вывучэння беларускай і балгарскай моў, арганізуюць навуковыя канферэнцыі. На філалагічным факультэце Сафійскага універсітэта паспяхова працуюць выкладчыкі беларускай мовы, а ў БДУ з 1979 года адкрыты лекторый балгарскай мовы.

Вывучэнне балгарскай мовы ў БДУ мае трыццацігадовую гісторыю. За гэты час пад кіраўніцтвам вопытных выкладчыкаў М. М. Полазава, В. М. Цімафеевай, Б. Ю. Нормана, В. А. Карпава і іншых многія студэнты атрымалі магчымасць азнаёміцца з высновамі балгарскай мовы, з героямі яе літаратурных твораў. Некаторыя з выпускнікоў сталі кваліфікаванымі спецыялістамі - экскурсаводамі, даследчыкамі.

Абапіраючыся на багаты педагагічны вопыт сваіх савецкіх калег, адчуваючы ўвагу і падтрымку з боку кіраўнікоў факультэта, балгарскія лектары, што працуюць у БДУ, і сярод іх прафесар Блажа Блажаў, уносяць свой уклад у далейшае ўдасканаленне выкладання славянскіх моў, у развіццё супрацоўніцтва паміж нашымі універсітэтамі.

Вось ужо трэці год, як я ўдзельнічаю ў падрыхтоўцы маладых славістаў Беларускага універсітэта. Звыш 200 студэнтаў падрыхтавана мной за гэты перыяд. Хочацца адзначыць тую вялікую радасць, якую адчуваю я ад сваёй працы на працягу гэтых трох гадоў у Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна, працуючы з такімі дапытлівымі студэнтамі, як А. Пахкавец, А. Рудэнка, А. Радзевіч, І. Зодзіч і многія іншыя.

Карыстаючыся выпадкам, хачу павіншаваць усіх сваіх студэнтаў, савецкіх і балгарскіх, са знамянальнымі датамі—40-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 40-годдзем сацыялістычнай рэвалюцыі ў Балгарыі.

**Цветан ЙЕТАЎ,**
**дацэнт Сафійскага універсітэта імя К. Ахрыдскага, кандыдат філалагічных навук.**

● КАРОТКАЯ ДАВЕДКА

## НАШ ПАБРАЦІМ

Днём нараджэння Сафійскага універсітэта з'яўляецца 1 верасня 1888 года. У гэты дзень былі адкрыты Вышэйшыя педагагічныя курсы з гісторыка-філалагічным факультэтам, на якім працавала 7 выкладчыкаў і вучыліся 43 студэнты. У наступным, 1889 годзе, быў заснаваны фізіка-матэматычны факультэт. Затым адкрыліся юрыдычны (1892 г.), медыцынскі (1918 г.), агранамічны, ветэрынарны і багаслоўскі (1921 г.) факультэты.

Аднак сапраўдным флагманам вышэйшай адукацыі Сафійскі універсітэт стаў у гады народнай улады. На базе асобных факультэтаў універсітэта былі створаны Медыцынская акадэмія, Вышэйшы ветэрынарна-медыцынскі інстытут, Вышэйшы лесатэхнічны інстытут і іншыя ВНУ балгарскай сталіцы.

Зараз у вышэйшай навучальнай установе НРБ на дванаццаці факультэтах, на якіх працуюць 104 кафедры, рыхтуюцца высокакваліфікаваныя кадры па 32 спецыяльнасцях. 1450 прафесараў, дацэнтаў, асістэнтаў вучаць каля 9 000 студэнтаў.

Універсітэт падтрымлівае сяброўскія сувязі з 25 універсітэтамі многіх краін Еўропы і Японіі. Як адзначаў прарэктар Сафійскага універсітэта прафесар Андрэй Апосталаў, асабліва моцныя сувязі падтрымліваюцца з універсітэтамі сацыялістычных краін — Маскоўскім, Беларускім, Пражскім, Берлінскім, Будапешцкім і іншымі.

● З ФОТААРХІВА РЭДАКЦЫІ



Балгарскія студэнты ў час азнаямленчай практыкі ў БДУ імя У. І. Леніна.

# ЛІНІІ

тэмы «Параўнальныя даследаванні граматыкі беларускай і балгарскай мовы». У рамках праграмы навуковага супрацоўніцтва паміж нашымі універсітэтамі былі праведзены тры сімпозіумы «Беларуска-балгарскія моўныя сувязі» ў 1976 і 1982 гадах у Мінску і ў 1979 годзе ў Сафіі. На першы было прадстаўлена 23, на другі — 16 і на трэці — 24 даклады савецкіх і балгарскіх аўтараў. Як практычны вынік даследаванняў будуць выдадзены нарысы параўнальнай граматыкі балгарскай і беларускай моў.

Гісторыкі Беларускага і Сафійскага універсітэтаў Д. Б. Мельцар і Й. Тончаў надрукавалі ў Мінску сумесную манаграфію «Нацыянальнай Балгарыі — 100 гадоў», а географы В. Г. Заўрыеў, М. Т. Раманоўскі, В. Вялеў выдалі ў Сафіі кнігу «Беларусь».

Беларускі дзяржаўны універсітэт з'яўляецца адным з цэнтраў балгарыстыкі ў краіне. Вітаючы ўдзельнікаў Усесаюзнай канферэнцыі савецкіх балгарыстаў, Генеральны сакратар ЦК БКП, Старшыня Дзяржаўнага савета НРБ таварыш Тодар Жыўкаў пісаў: «З асабліва вялікай увагай і ўдзячнасцю мы сочым за ўкладам савецкіх балгарыстаў, якія прытрымліваюцца высокіх традыцый рускай, украінскай, беларускай балгарыстыкі і славістыкі мінулага і ўзбагачаюць яе».

Толькі за апошнія гады быў выдадзены шэраг манаграфій, вучэбнікаў і вучэбных дапаможнікаў па гісторыі і літаратуры Балгарыі, балгарскай мове, якія атрымалі высокую ацэнку навуковай грамадскасці Савецкага Саюза і Народнай Рэспублікі Балгарыі, Першага міжнароднага кангрэса балгарыстаў у Сафіі ў маі 1981 года. Сярод іх вучэбнікі прафесара А. Я. Супруна і дацэнта А. М. Калюты «Уводзіны ў славянскую філалогію», дацэнта Б. Ю. Нормана «Балгарская мова». Прафесар Н. С. Гілевіч апублікаваў манаграфію «Верная вялікім запаветам (сучасная балгарская паэзія. 1956—1976 гг.)». Былі выдадзены манаграфіі прафесара Д. Б. Мельцара «Савецка-балгарскія адносіны 1917—1935 гг.», «Беларусь і Балгарыя: дружба вечная, непарушная», дацэнта М. П. Квочкіна «Балгарыя: збліжэнне горада і вёскі ва ўмовах сацыялістычнага супрацоўніцтва» і іншыя. Шэраг прац супрацоўнікаў універсітэта надрукаваны ў Балгарыі.

Ва універсітэце рэгулярна праводзяцца канферэнцыі, прысвечаныя знамянальным падзеям у жыцці балгарскага народа — 100-годдзю Красавіцкага паўстання (1976 г.), 100-годдзю вызвалення Балгарыі ад асманскага іга (1978 г.), 1300-годдзю заснавання балгарскай дзяржавы (1981 г.), 100-годдзю з дня нараджэння Георгія Дзімітрава (1982 г.), 40-годдзю сацыялістычнай рэвалюцыі ў Балгарыі (1984 г.) і іншым.

Ужо традыцыяй стала правядзенне савецка-балгарскіх студэнцкіх навуковых канферэнцый. Сёлетняя, XI канферэнцыя, прысвячаецца 40-годдзю сацыялістычнай рэвалюцыі ў Балгарыі.

Балгарыстыка займае ўсё большае месца ў вучэбным працэсе.

Студэнты гістарычнага факультэта вывучаюць гісторыю Балгарыі, ім чытаюць спецыяльныя курсы аб сацыялістычным будаўніцтве ў Балгарыі, гісторыі савецка-балгарскіх адносін, беларуска-балгарскіх гістарычных сувязях. На філалагічным факультэце выкладаюцца балгарская мова, гісторыя балгарскай літаратуры. Студэнты пішуць курсавыя і дыпломныя работы па балгарскай праблематыцы. Многія студэнцкія навуковыя работы атрымалі высокую ацэнку на рэспубліканскіх і ўсесаюзных конкурсах.

Фундаментальная бібліятэка БДУ імя У. І. Леніна вядзе рэгулярны кнігаабмен з бібліятэкай Сафійскага універсітэта, народнай бібліятэкай імя Кірылы і Мяфодзія. Пастаянна арганізуюцца кніжныя выстаўкі.

Актывізаваліся кантакты паміж грамадскімі арганізацыямі. Па ініцыятыве камітэта ЛКСМБ праводзіцца абмен студэнцкімі будаўнічымі атрадамі. Інтэрнацыянальны СБА імя Георгія Дзімітрава плённа працаваў на адным з камсамольскіх аб'ектаў г. Мінска, а наш СБА імя Л. Карастаянавай — у балгарскім горадзе Ямболе.

З вялікім поспехам нядаўна ў актавай зале нашага універсітэта выступаў фальклорны ансамбль студэнтаў Сафійскага універсітэта, а ў чэрвені калектыў мастацкай самадзейнасці БДУ будзе госцем балгарскіх студэнтаў.

Значны ўклад у развіццё сяброўскіх сувязей нашых універсітэтаў уносіць аддзяленне Таварыства савецка-балгарскай дружбы, створанае ў студзені 1969 года. З таго часу было праведзена больш за 200 масавых мерапрыемстваў. Добры водзыў атрымалі комплексныя мерапрыемствы, прысвечаныя XII з'езду БКП, XIV з'езду Дзімітраўскага Камуністычнага Саюза Моладзі, 90-годдзю ўтварэння Балгарскай сацыял-дэмакратычнай партыі, 70-годдзю з дня нараджэння Тодара Жыўкава, 60-годдзю Вераснёўскага ўзброенага паўстання 1923 года, 50-годдзю Лейпцыгскага працэсу і інш. Асабліва шырока адзначалася 100-годдзе з дня нараджэння Георгія Дзімітрава.

Ва універсітэце сістэматычна праводзяцца цыклы лекцый, кіналекторыі, віктарыны, прысвечаныя сацыялістычнай Балгарыі, непарушнай савецка-балгарскай дружбе, экспаніруюцца выстаўкі, якія расказваюць аб дасягненнях балгарскага народа ў будаўніцтве развітога сацыялізму, яго гісторыі і культуры.

Вялікая ўвага ўдзяляецца цеснаму супрацоўніцтву з балгарскім зямляцтвам, азнаямленню балгарскіх студэнтаў і аспірантаў з жыццём савецкага народа, з дасягненнямі Беларускай ССР.

З кожным годам дружба і супрацоўніцтва універсітэтаў-пабрацімаў мацнее, удасканальваецца, узбагачаецца новымі формамі.

**Д. МЕЛЬЦАР,**
**прафесар, намеснік старшыні аддзялення Таварыства савецка-балгарскай дружбы.**

# «У НАС ЁСЦЬ СВОЙ ГОНАР»

НА ЧЭМПІЯНАЦЕ ЕЎРОПЫ ў Швецыі савецкія барцы класічнага стылю яшчэ раз даказалі, што яны мацнейшыя на кантыненце. Зборная СССР заваявала шэсць залатых, адзін сярэбраны і два бронзавыя медалі. Гледачы горача апладзіравалі нашым барцам. Але на чэмпіянаце спартсмены з розных краін выказвалі трывогу наконт небяспечнасці ўдзелу ў будучай Алімпіядзе.

Мне пашанцавала ў саставе зборнай краіны пабываць у Грэцыі, на радзіме Алімпійскіх гульняў. Не забуду цёплыя адносіны грэкаў. Спартсмены Грэцыі ўспаміналі Маскоўскую Алімпіяду, дружалюбную атмасферу, якая ўладарыла там. І зусім кантрасна выглядаюць абставіны ў Лос-Анджэлесе. Амерыканскія ўлады вырашылі правесці гульні ў сваіх карыслівых мэтах. Яны прадэманстравалі, што Алімпіяда для іх—гэта бізнес. Нават этапы эстафеты алімпійскага агню былі распрададзены. Не меншую трывогу выклікаюць падрыўныя дзеянні антысавецкіх арганізацый. Члены іх адкрыта выступаюць супраць савецкіх спартсменаў, пагражаюць расправай. Але ў нас ёсць свой гонар. Даўняе правіла гаворыць: «Калі чалавек ведае, што яго ў гасцях абразяць, ён не ідзе ў госці». Так паступілі і нашы спартсмены. Мы падтрымліваем рашэнне НАК СССР аб немагчымасці ўдзельнічаць у Алімпійскіх гульнях у Лос-Анджэлесе.

**К. МАДЖЫДАЎ,**
**чэмпіён Еўропы, студэнт юрыдычнага факультэта.**

**АД РЭДАКЦЫІ: Мы горача віншуем Камандара Маджыдава з перамогай на чэмпіянаце Еўропы па класічнай барацьбе і прысуджэннем яму прыза «За самую прыгожую перамогу чэмпіяната». Жадаем далейшых вялікіх поспехаў у вучобе і спорце!**

# УСЁ ВЫРАШЫЦЬ ФІНАЛ

КАЛІ СУДДЗІ вывелі каманды БДУ і «Спартака» (Віцебск) на пляцоўку, то адразу кінулася ў вочы, што ўсе спартсменкі хвалююцца. Паўфінальныя матчы на кубак БССР па баскетболу, якія праходзілі ў спартыўнай зале галоўнага корпуса, павінны былі назваць аднаго з чатырох фіналістаў. У Віцебску «Спартак» двойчы выйграў і меў у запасе 27 ачкоў. Праўда, тады не гулялі Рубан, Сяверчанка, Дадычына і Дамарацкая.

Яны і склалі «ўдарнае» звяно ў паўторных матчах. Віцябчанкі ведалі гэта, таму і звярнулі на іх шмат увагі, але гульню на сябе ўзяла капітан каманды Рыта Хаткевіч. Яна раз за разам пасылала мяч у кальцо сапернікаў.

Пачатак другога тайма з'явіўся нечаканым для «Спартака». Мінчанкі на дзіва хутка давялі лік да 62:37. Удала выконвала ролю дырыжора Алена Дадычына, някепска спраўлялася з абавязкамі цэнтравой Кацярына Рубан, «пайшла» гульня ў Ірыны Дамарацкай, Ірыны Фурынай і Аксаны Чарновай. Саперніцы не вытрымалі тэмпу. Свісток суддзі апавясціў перамогу каманды універсітэта—90:59.

Дарэчы, у саставе каманды «Гарызонт» Алена Дадычына, Алена Сяверчанка і Кацярына Рубан занялі трэцяе месца на чэмпіянаце СССР сярод юніёрскіх саставаў каманд вышэйшай лігі.

**У. АБРАМОВІЧ,**
**наш кар.**

## ЛЁГКААТЛЕТЫЧНЫ КРОС

# ПОСПЕХ, АЛЕ...

ДВАЦЦАЦЬ СЁМЫ раз праводзілася лёгкаатлетычная эстафета на вуліцах горада, якую штогод арганізуе БДУ імя У. І. Леніна. Але ніколі гэтыя старты не праводзіліся так урачыста і арганізавана. Перад удзельнікамі з прывітальнымі словамі выступілі прарэктар універсітэта У. С. Багданаў, старшыня камітэта па фізічнай культуры і спорту пры Мінгарвыканкоме В. У. Бабіцкі.

Адкрылі спаборніцтвы члены гарадскога клуба аматараў бегу. А затым адбыліся эстафеты. Пераможцамі ў сваіх групах сталі: СШ № 52, Мінскі індустрыяльны тэхнікум, тэхнічнае вучылішча № 31, спартыўны клуб «Трактар». Але ўсе з нецярпеннем чакалі стартаў студэнцкіх каманд, майстэрства якіх было значна вышэйшым, чым у астатніх. На старт выйшла 11 ВНУ, прычым ІФК выставіў дзве каманды.

Эстафета складалася з дзевятнаццаці неаднолькавых па даўжыні этапаў. З першых метраў наперад вырваліся бегуны каманд ІФК-1 і педінстытута. Студэнт мехмата БДУ П. Курышка перадаў эстафетную палачку трэцім. Намаганнямі А. Барысенкі (мехмат) і Т. Міраноўскай (юрфак) універсітэт перамясціўся на другое месца. Але на пяты этап Ала Трахаўцова (хімфак) пабегла толькі чацвёртай. Тым не менш яна змагла абагнаць моцныя каманды БПІ і ІФК-2 і перадаць эстафету Аляксандру Міхалёнку (гістфак) другой. Міхалёнак замацаваў поспех Алы, і затым бегуны універсітэта яшчэ больш павялічылі разрыў. На фінішы яны былі другімі ўслед за камандай ІФК-1. Акрамя вышэй названых спартсменаў, за каманду выступалі Г. Гутар, Р. Грыбкоўскі (фізфак), А. Міхейкін, Т. Баярка, А. Эйсманд (ФПМ), Т. Ермачэнка, Н. Жаркова (юрфак), А. Трыбушэўскі, Н. Цішына (гістфак), Н. Бяжок (філфак), В. Касцяйкоў (хімфак), А. Масіна (біяфак), В. Сухамазава (журфак), Н. Лукашэвіч (мехмат). Трэцімі фінішыравалі спартсмены РТІ.

Безумоўна, другое месца з'яўляецца поспехам, але нельга не звярнуць увагу на тое, што нашы бегуны не змаглі аказаць ніякага супраціўлення спартсменам каманды ІФК-1. Прычым разрыў у параўнанні з мінулым годам павялічыўся. На гэта патрэбна звярнуць увагу трэнерам.

**Л. ХРАКОЎСКІ,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**



**НА ЗДЫМКУ:** эстафетную палачку нясе студэнтка 2 курса факультэта журналістыкі, кандыдат у майстры спорту Вольга Сухамазава.

Фота **Д. Вількевіча.**



## ФЕЛЬЕТОН




КАЛІ ВЫ ўважліва сочыце за тэлевізійнай спрэчкай «Клуба знаўцаў» паміж камандамі тэлегледачоў і эрудытаў, то, пэўна, ужо адзначылі, што апошніх «агарошыць» складаным пытаннем цяжка. Паціраючы свае сакратаўскія скроні і чухаючы архімедавы патыліцы так, што ад думак пацеюць акуляры, яны зноў і зноў бяруцца даць адказы на самыя неспадзяваныя пытанні сваіх тэлепрацаўнікаў. І патрэбна адзначыць, не без поспеху. Ва ўсякім разе па выніках апошняга тэлематча эрудыты зноў ідуць на адно ачко наперадзе.

Таму звяртаюся да вас, шаноўныя балельшчыкі, што трымаюць бок гледачоў. Як вядома, каб адыграць гэтае ачко, неабходна задаць пытанне, якое здолее паставіць у тупік масцітых эрудытаў.

Прапаную пытанні. Першае: «Якія цыгарэты больш за ўсё падабаюцца Зеўсу Алімпійскаму?» Другое: «Чым займаюцца багі ў вольны ад грамадскай дзейнасці час?». Трэцяе... Стоп, стоп... Трэцяе пытанне мае сэнс не абвяшчаць, пакуль не стануць вядомымі адказы на першыя два. Пакінем яго на апошні, рашаючы момант.

А зараз даём пераканаўчыя тлумачэнні па першаму пытанню. Магчыма, эрудыты, якія антычную гісторыю ведаюць як свае пяць пальцаў, а алімпійскіх багоў лепш за сваю радню, пачнуць сцвярджаць, што Зеўс наогул не з'яўляўся аматарам тытунёвых вырабаў. Магчыма, яны пачнуць вам цытаваць Гамера, пераконваць, што ў старажытнай Грэцыі не ведалі ні курыльнага, ні нюхальнага тытуню. Яны могуць успомніць, што маракі Хрыстафора Калумба толькі ў канцы XV стагоддзя недарэчы завезлі ў Стары Свет гэтую расліну, якая нарабіла такой бяды, што бараніць ад яе людзей заклікае Мінздраў СССР. Карацей кажучы, так ці інакш яны будуць даводзіць вам, што ніякіх цыгарэт грэчаскія багі зведаць не паспелі, тым больш прыахвоціцца да іх.

Але што б вам ні казалі эрудыты, на каго б ні спасылаліся, ведайце: тут іх справы, кажучы па-руску – «табак». Ёсць сведкі, якія пад прысягай могуць пацвердзіць, што «ўладар уладароў» і «грамавержац» любіць часам пацешыць сябе цыгарэтным дымам. Аўтару гэтых радкоў самому аднойчы давялося бачыць, як сын Кронаса ўшчэнт, пад самы фільтр, раскурыў цыгарэту «Палессе». Рабіў ён гэта заўзята, флегматычна, не звяртаючы ўвагі на шыльдачку «Не курыць», што прымацавана да сцяны на пятым паверсе галоўнага корпуса універсітэта. Тут застаецца толькі адрасаваць па сутнасці не памыліўшымся эрудытам старадаўнюю прыказку: «Лепш раз пабачыць, чым...»

Па другому пытанню сведкаў знайсці ў гэты момант ужо цяжка. Але тут мы ў сваю чаргу спашлемся на некаторыя звесткі, што пакінулі продкі. Нагадаем, напрыклад, сведчанні, якія пакінуў нам Тарас з Пуцявішча, былы палясоўшчык, якому пашанцавала аднойчы апынуцца на Парнасе:

Бах сп'яну пеў такі прыпеўкі,
Што аж няможна гаварыць,
Аж засаромеліся дзеўкі,
Так стаў ён брыдка
развадзіць...

І крыху далей:

Вось б'юцца Марс ды з
Геркулесам,
А Геркулес, як той
мядзведзь,—
Каб цешыць старага Зевеса,
Хахол ён Марсу добра
мнець...

Дзелячыся ўражаннямі ад таго, як алімпійскія багі скарыстоўваюць свой вольны час, Тарас, відаць, не пакрывіўшы ні душой, ні словам, сведчыць далей:

І кожны бог так разгуляўся,
Што аж не можна
ўдзяржаць...

На жаль, мы не маем больш пэўных звестак аб норавах сучасных уладароў Парнаса, Алімпа, а таксама пятага-шостага паверхаў галоўнага корпуса БДУ, дзе размясціліся будучыя гісторыкі. Няма, зазначым пра сябе, такіх звестак і ў камітэце камсамола гістарычнага факультэта. Дрэнна, што няма. Таму што размова, як стане відаць крыху пазней, датычыць не столькі багоў, колькі рэальных людзей.

Як бы там ні было, але ўскосныя доказы дазваляюць меркаваць, што старадаўні дух алімпійцаў не стаў з цягам часу больш анёльскім. Хутчэй, наадварот. Інакш чым растлумачыць тое, што ў антычных герояў такія «намятыя» хахлы, як у «Афрадзіты» скульптара Алкамена на пятым паверсе, у якой абламана кісць левай рукі. Літаральна знішчалі сябе, ламаючы, відаць, адзін аднаму пальцы, рукі, скручваючы галовы на сваіх вакханаліях, «высокагрымячыя хмараганіцелі» з шостага паверха. Урэшце іх усіх схавалі ў асобны пакой — на людзях пакідаць было ўжо небяспечна.

Асабліва чымсьці не падабаўся міфічным буянам посуд. Пабіты на чарапкі, ён зараз знесены ў завуголле на пяты паверх. Больш-менш цэлыя глякі зараз там выконваюць ролю сметніц. На падстаўцы аднаго з іх яшчэ можна разабраць літары: «Ваза. Грэцыя класічнага перыяду». Ну чым не раскоша— усім багам на зайздрасць!

Каб расставіць усе кропкі над «і», адкрыем: гутарка ўвесь час ідзе аб копіях, зробленых з сусветна вядомай скульптурнай спадчыны антычнай Грэцыі, выстаўленых на паверхах гістарычнага факультэта. Дакладней кажучы, аб іх незайздросным выглядзе ў сучасны момант.

А зараз — не да жартаў! Магчыма, для некага і смешна — Апалон Бельвядзерскі з акуркам «Прымы» ў каменных вуснах. Не ведаю. Кожны, як кажуць, бавіцца ў межах сваёй разбэшчанасці. Разбэшчанасць гэта, як бачыце, шугае часам праз усе межы. Не раптам, вядома, шугае, пакрысе.

Спачатку, магчыма, посуд у сталовай не захацеў занесці пасля сябе да акенца мыечнай, потым імя свае, ганарлівае, ад няма чаго рабіць выскраб на парце ў час лекцыі. Далей — болей. Хто такога спыніць?

Дамагаюся адказаў таму, што тых, хто павінен быў гэта зрабіць,— многа, занадта многа. Дамагаюся таму, што кожны павінен быў бы ўбачыць у твар тых зламыснікаў, якія, шкодзячы, «прывучалі курыць» і «Зеўса», і «Венеру», і «Апалона», і іншыя гіпсавыя скульптуры на пятым-шостым паверхах, пакаранымі па ўсёй строгасці закона за наўмыснае псаванне сацыялістычнай маёмасці.

Вось лічбы: у апошні раз, у 1978 годзе, на аднаўленне копій гіпсавых скульптур універсітэт вымушаны быў патраціць больш за 6 тысяч рублёў. Тады было растаўрыравана 118 адзінак бюстаў, барэльефаў, статуэтак... У гэтым годзе супрацоўнікі універсітэцкага музея зноў павінны траціць прыкладна такую ж суму грошай на тое, каб аплаціць нечыя «забавы».

Няма чаго доўга гаварыць пра пачуццё свядомасці. Зрэшты, для таго, каб цябе называлі варварам, не абавязкова было нараджацца гунам або готам у часы падзення Рымскай імперыі. Дастаткова проста быць ім.

Хіба не так? — гэта апошняе пытанне на карысць гледачоў. Падкрэсліваю: гледачоў!

**В. ЧАРНЯЎСКІ,**
**наш кар.**

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

17 мая 1984 г.

АТ 10238 Зак. 831.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар **В. П. ВАРАБ'ЁЎ**